
Шымпанзэ звычайны


Гарыла заходняя


Арангутан калімантанскі

**Мал. 200.** Чалавекападобныя малпы

**Паўторым галоўнае.** Да атрада Хобатныя належаць самыя буйныя наземныя млекакормячыя свету — сланы. Іх адметнымі рысамі з'яўляюцца вялікія вушныя ракавіны, шматфункцыянальны хобат, біўні. Прадстаўнікі атрада Прыматы — самыя высокаарганізаваныя жывёлы. У іх пяціпальцавыя канечнасці, вялікі палец супрацьпастаўлены іншым, замест кіпцюроў — пазногці. Развіта кара вялікіх паўшар'яў. Прыматы адрозніваюцца складанымі паводзінамі.

**Пытанні і заданні.** **1.** Дзе жывуць сланы і чаму яны не насяляюць паўночныя рэгіёны планеты? **2.** Якое значэнне ў жыцці слана маюць вушы і хобат? **3.** Чаму прыматы з'яўляюцца высокаарганізаванымі жывёламі? **4.** Якія асаблівасці будовы дазваляюць прыматам спрытна перамяшчацца па дрэвах? **5.** Што агульнага ў чалавекападобных малпаў з чалавекам?

## § 58. Роля млекакормячых у прыродзе і значэнне ў жыцці чалавека. Сельскагаспадарчыя жывёлы

**Успомніце:** **1.** Якую ролю ў прыродзе выконваюць рыбы, земнаводныя, паўзуны і птушкі? **2.** Якое значэнне ў жыцці чалавека маюць рыбы, земнаводныя, паўзуны і птушкі?

**Роля млекакормячых у прыродзе.** Як і ўсе жывыя арганізмы, млекакормячыя з'яўляюцца неад'емным звяном у ланцугах харчавання. Некаторыя раслінаедныя млекакормячыя могуць знішчыць значную колькасць раслін на тэрыторыі свайго пражывання. Часам яны здольны пераўтвараць ландшафты. Напрыклад, пабудаваныя бабрамі

Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

плаціны прыводзяць да ўздыму ўзроўню грунтавых вод, забалочвання мясцовасці, пасля чаго лугі могуць стаць балотамі. Такія млекакормячыя, як мышы, вавёркі, дзікі, спрыяюць распаўсюджванню насення і спораў, а значыць, рассяленню раслін на вялікія адлегласці.

Млекакормячыя, якія насяляюць глебу (краты, мышы, палёўкі, буразубкі), рыхляць яе, насычаючы кіслародам. Гэта павышае ўрадлівасць глебы і паляпшае ўмовы жыцця яе насельнікаў. Памёт жывёл таксама робіць глебу больш урадлівай.

Насякомаедныя (вожыкі, краты) і рукакрылыя (кажаны) стрымліваюць павелічэнне колькасці насякомых і іх лічынак, якія з'яўляюцца шкоднікамі раслін.

Драпежныя млекакормячыя (ваўкі, лісіцы, рысі) рэгулююць колькасць раслінаедных жывёл і грызуноў. Ахвярамі буйных драпежнікаў у першую чаргу становяцца хворыя, траўміраваныя, старыя і аслабленыя жывёлы. У выніку ў размнажэнні будуць удзельнічаць моцныя і здаровыя асобіны віду, якія прынясуць больш жыццяздольнае патомства. Акрамя таго, драпежныя млекакормячыя, кормячыся мёртвымі жывёламі, выконваюць ролю санітараў прыроды.

**Значэнне млекакормячых у жыцці чалавека.** Некаторыя віды наносяць шкоду сельскай гаспадарцы. Напрыклад, многія грызуны кормяцца рознымі часткамі раслін, пасля чаго расліны гінуць. Пасяляючыся побач з чалавекам, мышы знішчаюць або робяць непрыдатнымі запасы збожжавых культур, а таксама могуць распаўсюджваць небяспечныя інфекцыйныя захворванні. Драпежныя жывёлы (ваўкі, лісы, тхары) здольны нападаць на свойскіх жывёл.

Аднак млекакормячыя прыносяць чалавеку і карысць. Некаторыя віды дзікіх млекакормячых становяцца аб'ектамі промыслу з мэтай атрымання каштоўнага футра, скуры, мяса, тлушчу. Асноўныя прамысловыя жывёлы — лісы, ласі, дзікі, казулі, бабры, зайцы.

Многія віды млекакормячых (хамякі, мышы, пацукі, трусы, сабакі) з'яўляюцца аб'ектамі лабараторных навуковых даследаванняў.

Некаторых млекакормячых чалавек заводзіць у якасці дамашніх гадаванцаў — гэта разнастайныя пароды сабак, катоў, а таксама дэкаратыўныя пароды *марскіх свінак*, *хамякоў* (мал. 201), *пацукоў*, *трусоў*.



Марская свінка



Хамяк

**Мал. 201.** Дэкаратыўныя млекакормячыя

Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

|  |  |  |  |
| --- | --- | --- | --- |
| Карова чорна-пярэстай пароды | Авечкі пароды тэксель | Каза зааненскай пароды | Свіння пароды буйная белая |

**Мал. 202.** Сельскагаспадарчыя жывёлы, якіх разводзяць у Беларусі

**Сельскагаспадарчыя жывёлы.** Жывёлы, якіх чалавек гадуе з мэтай атрымання прадуктаў харчавання і сыравіны для прамысловасці, атрымалі назву сельскагаспадарчых. Іх развядзеннем займаецца адна з найважнейшых галін сельскай гаспадаркі — жывёлагадоўля. Найважнейшае месца ў жывёлагадоўлі нашай краіны займае развядзенне буйной і дробнай рагатай жывёлы, авечак і свіней (мал. 202). Прадукты жывёлагадоўлі — каровіна і казінае малако, мяса і тлушч, шэрсць і скура. У выніку перапрацоўкі малака атрымліваюць масла, сыр, тварог, смятану, кефір і іншыя прадукты харчавання.

У цяперашні час праводзяцца працы па вывядзенні новых парод сельскагаспадарчых жывёл.

**Паўторым галоўнае.** Млекакормячыя з'яўляюцца неад'емным звяном у ланцугах харчавання. Адны спрыяюць распаўсюджванню насення і спор раслін, другія павышаюць урадлівасць глебы, трэція рэгулююць колькасць іншых жывёл. Некаторыя млекакормячыя — шкоднікі хатняй і сельскай гаспадарак. Многія віды млекакормячых з'яўляюцца важнымі аб'ектамі промыслу. Жывёлагадоўля — адна з асноўных галін гаспадаркі, якая дае харчовую прадукцыю, сыравіну для іншых галін прамысловасці.

**Пытанні і заданні.** **1.** Якую ролю выконваюць млекакормячыя ў прыродзе? **2.** Апішыце значэнне дзікіх млекакормячых для чалавека. **3.** Як вы думаеце, ці змогуць свойскія жывёлы жыць у дзікай прыродзе? **4.** Для праверкі ведаў па § 49–58 выканайце тэставае заданне.

**Біялагічныя рэкорды**

- Самая хуткая наземная жывёла — *гепард*. Звышгнуткі пазваночнік і доўгія лапы дазваляюць яму разганяцца за 2 секунды да 75 км/г, за 3 секунды — да 110 км/г.
- Самае буйное наземнае млекакормячае — *слон саванны*. Маса яго можа дасягаць 7 т, рост — 4 м.
- Самая высокая наземная жывёла — жырафа. Зафіксавана асобіна ростам 5 м 86 см.

Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

## ПАДВЯДЗЁМ ВЫНІКІ

| Асноўныя прыметы *класа Млекакормячыя* | |
|---|---|
| **Прадстаўнік** | *Сабака свойскі* |
| **Асяроддзе пражывання** | Наземна-паветранае, воднае, глебавае |
| **Асаблівасці знешняй будовы** | Цела стройнае, мускулістае. Складаецца з галавы, шыі, тулава, пярэдніх і задніх канечнасцей. Канечнасці змешчаны пад тулавам |
| **Покрывы цела** | Скура тоўстая, трывалая і эластычная. Ёсць скурныя залозы (тлушчавыя, потавыя, малочныя) і валасяное покрыва |
| **Шкілет** | Касцявы, трывалы. Уключае: чэрап, пазваночнік і грудную клетку, шкілет пярэдніх канечнасцей (косці плечавога пояса і косці свабодных пярэдніх канечнасцей) і шкілет задніх канечнасцей (косці тазавага пояса і косці свабодных задніх канечнасцей). Пазваночнік: шыйны, грудны, паяснічны, крыжавы і хваставы аддзелы. У шыйным аддзеле сем пазванкоў. Ключыцы не развіты |
| **Мышачная сістэма** | Найбольш развіты мышцы спіны, канечнасцей і іх паясоў. Ёсць мышачная перагародка — дыяфрагма, якая падзяляе брушную і грудную поласці цела |
| **Стрававальная сістэма** | Пярэдні аддзел (рот, глотка, стрававод, страўнік), тонкая кішка, тоўстая кішка. Ёсць слінныя залозы, печань, падстраўнікавая залоза. Зубы дыферэнцыраваны на разцы, іклы і карэнныя |
| **Дыхальная сістэма** | Дыхальныя шляхі (насавая поласць, насаглотка, гартань, трахея, бронхі). Альвеалярныя лёгкія |
| **Крываносная сістэма** | Замкнёная. Чатырохкамернае сэрца: два перадсэрдзі і два жалудачкі. Два кругі кровазвароту. Цеплакроўныя |
| **Нервовая сістэма** | Галаўны мозг, спінны мозг (цэнтральная нервовая сістэма), нервы, якія адыходзяць ад іх да ўсіх органаў. Галаўны мозг: пярэдні мозг, прамежкавы мозг, сярэдні мозг, мазжачок і прадаўгаваты мозг. Кара вялікіх паўшар'яў пярэдняга мозга павялічылася за кошт барознаў і звілін. Развіты мазжачок |
| **Органы пачуццяў** | Орган зроку — вочы. Орган слыху — унутранае вуха, сярэдняе вуха і знешняе вуха. У сярэднім вуху тры слыхавыя костачкі: малаточак, кавадлачка і стрэмечка. Развіта вушная ракавіна. Органы нюху, дотыку, смаку |
| **Выдзяляльная сістэма** | Пара тазавых нырак. Мачаточнік. Мачавы пузыр. Мочаспускальны канал |
| **Палавая сістэма** | Раздзельнаполыя. Апладненне ўнутранае. Унутрывантробнае развіццё зародка адбываецца ў матцы. Кармленне зародка ажыццяўляецца праз плацэнту. Жыванараджэнне |

Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»